Гаўрылаў І.

# БАЯВЫ ШЛЯХ ГЕРОЯ-ЗЕМЛЯКА

...У Дзмітрыя Шамянкова з вёскі Гніліца была вялікая сям'я. Каб пракарміць яе, трэба было многа працаваць. І ён працаваў, дзень і ноч гнуў сваю спіну на памешчыка Баранава. Вывучыць дзяцей яму не давялося. Толькі сын Афанасій скончыў тры класы сельскай школы, астатнія дзеці былі непісьменныя.

Пасля 10-гадовы хлапчук таксама пачаў батрачыць у памешчыка. Ён не мог змірыцца са здзеквамі багацея, з непасільнай дармавой работай. У 15-гадовым узросце юнак пакінуў вёску і паехаў у Данбас. Там уладкаваўся працаваць на адной з вугальных шахт. Адсюль, у 1915 годзе, Афанасія Дзмітрыевіча прызвалі на службу ў царскую армію.

...Адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя. Афанасій Шамянкоў вяртаецца ў Данбас, і тут, у сакавіку 1918 года ўступіў у партызанскі атрад, які вёў барацьбу з белаказакамі генерала Краснова. У маі таго ж года А. Д. Шамянкоў уступае ў рады Чырвонай Арміі. Скончыўшы ў 1919 годзе курсы камандзіраў, ён камандаваў узводам, ротай, потым батальёнам. Пад яго ўмелым кіраўніцтвам воіны наносілі адчувальныя ўдары на войсках Калчака і Врангеля. Тады, у цяжкі для маладой Савецкай рэспублікі час, А. Д. Шамянкоў назаўсёды звязаў свой лёс з лёсам Камуністычнай партыі.

Вялікая Айчынная вайна застала А. Д. Шамянкова на пасадзе камандзіра 69-й стралковай дывізіі. У 1941-42 гадах дывізія пад яго камандаваннем удзельнічала ў абароне Ленінграда. У другой палавіне 1942 года А. Д. Шамянкова назначаюць намеснікам камандзіра 4-га гвардзейскага корпуса 1-й гвардзейскай арміі, які ўдзельнічае ў наступленні пад Волгаградам. Афанасій Дзмітрыевіч праявіў тут стойкасць, мужнасць, уменне кіраваць войскамі. За гэтыя якасці Савецкі ўрад узнагародзіў яго ордэнам Чырвонага Сцяга.

**Кастрычнік 1943 года.**

А. Д. Шамянкоў – камандзір 57-й гвардзейскай стралковай дывізіі, якая дзейнічае ў саставе 3-га Украінскага фронту. У баях за вызваленне Украіны дывізія атрымала назву Нова-Бугская, а за вызваленне Адэсы ўзнагароджана ордэнам Багдана Хмяльніцкага ІІ ступені. Асабіста тав. Шамянкоў быў узнагароджан двума баявымі ордэнамі.

**Чэрвень 1944 года.**

Дывізія, якой камандуе А. Д. Шамянкоў, у саставе 8-й гвардзейскай арміі перакінута на 1-ы Беларускі фронт. 20 ліпеня дывізія фарсіравала Заходны Буг у раёне горада Ковеля, аднавіўшы на гэтым участку дзяржаўную граніцу Савецкага Саюза. А ў ноч на 1-е жніўня дывізія фарсіравала Віслу і захапіла плацдарм на яе левым беразе.

За ўзорнае выкананне загадаў камандавання і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць воінаў, 57-я гвардзейская дывізія Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9 жніўня 1944 года ўзнагароджана ордэнам Суворава II ступені. 25 лепшым воінам дывізіі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, звыш 2 тысяч салдат, сержантаў і афіцэраў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. А. Д. Шамянкову таксама было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Потым яго назначаюць камандзірам 29-га гвардзейскага стралковага корпуса.

**Студзень 1945 года.**

Злучэнні корпуса пачалі наступленне з Мангушэўскага плацдарма на Вісле. Імкліва наступаючы, 19 студзеня дывізіі корпуса на працягу сутачнага бою штурмам авалодалі буйным польскім горадам Лодзь. З 24 студзеня па 23 лютага дывізіі корпуса вялі ўпартыя, жорсткія баі за авалоданне старажытным горадам і крэпасцю Познань. Познаньскі гарнізон да пачатку штурму нашымі войскамі налічваў звыш 61 тысячы чалавек, 265 гармат і мінамётаў, 19 зенітных гармат, 42 танкі і 18 самаходных установак.

Штурм горада пачаўся 26 студзеня. Ішлі жорсткія баі за кожную вуліцу, кожны квартал, дом, паверх. Нягледзячы на тое, што праціўнік пераўзыходзіў нашы часці ў жывой сіле ў тры разы, ён не мог утрымацца пад націскам нашых войск. 23 лютага варожы гарнізон капітуляваў. За перыяд штурму было знішчана 35000 салдат і афіцэраў праціўніка, 25 тысяч чалавек узята ў палон. За мужнасць, адвагу і гераізм, праяўленыя ў баях за авалоданне горадам Познань, 17 байцам і афіцэрам корпуса было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, звыш 300 чалавек узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Камандзіру корпуса А. Д. Шамянкову было прысвоена званне генерал-лейтэнанта. Ён атрымаў ордэн Суворава II ступені.

**Красавік 1945 года.**

15 чысла з Кюстрынскага плацдарма на рацэ Одэр корпус пачаў наступальную аперацыю, якая закончылася штурмам і падзеннем логава фашысцкай Германіі – Берліна.

Тав. Шамянкоў А. Д. узнагароджан Залатой Зоркай Героя Савецкага Саюза, двума ордэнамі Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава II ступені і пяццю медалямі.

**Гаўрылаў, І. Баявы шлях Героя-земляка / І. Гаўрылаў // Чырвоны сцяг (Краснаполле). — 1979. — 14 чэрвеня. — С. 2.**